Сцэнарый тэматычнай праграмы

«СВЯТА НАШАГА ДОМА»

Складальнік: Іваненка Мікалай Міхайлавіч,

намеснік дырэктара гімназіі па вучэбнай рабоце

(У фанаграме гучаць патрыятычныя песні і класічная музыка.

За 2 хв. да пачатку музыка сціхае.)

Скрыпка і флейта: ***мелодыя бел. нар. песні.***

Гучыць беларуская народная песня "Кукуй, зязюля", спявае Паліна Шумская

Вядучыя: Добры дзень шаноўнаму спадарству!

Добры дзень, дарагія госці і ўдзельнікі нашага свята!

Утульная гімназічная зала гасцінна расчыніла свае дзверы для нас сапраўды з вельмі цікавай нагоды.

Дом № 23 па вуліцы Гагарына святкуе значны юбілей – сваё 30-годдзе!

Ад усяго сэрца мы віншуем жыхароў гэтага дома і прысвячаем ім тэматычную канцэртную праграму.

Я хачу па зямлі прайсці
Самым верным любімым сынам,
Каб дарогі мяне вялі
Пад вятрамі прасторам сінім,
Каб няўмоўчна ў мяне на плячах
Росным раннем спявалі птушкі,
Каб я кветкамі ўсімі прапах
Ад падэшваў да самай макушкі.
Я хачу па зямлі прайсці,
Каб мне людзі сэрцы адкрылі,
Слёзы радасці і мазалі

Па братэрску са мной дзялілі.
Каб легенды сівой даўніны
Мне з даверам дубы шапталі,
І крыніц залатыя званы
Для мяне калыхалі хвалі. (*Г. Бураўкін)*

Няма больш высокароднага пачуцця для чалавека, чым любоў да свайго роднага куточка.

Любоў, якая перапаўняе сэрца і дае чалавеку моц на добрыя справы дзеля сваіх родных і блізкіх, дзеля той зямлі, на якой ты нарадзіўся і вырас.

Той зямлі, дзе вякамі жылі твае продкі, пакінуўшы цудоўную гістарычную і культурную спадчыну, і на якой будуць жыць нашчадкі з добрай памяццю пра цябе і тваю самаахвярную любоў да Бацькаўшчыны.

Мы жадаем усім нам высокіх патрыятычных пачуццяў, бо без іх не бывае сапраўднага жыцця.

Для вас спявае вакальная група студыі патрыятычнай песні "Спадчына", мастацкі кіраўнік Аляксандр Вячаслававіч Жук, песня Анастасіі Віннікавай "Мая Беларусь"

Шаноўнае спадарства, са словамі святочнага прывітання да вас звяртаецца старшыня раённага Савета дэпутатаў Наталія Аляксандраўна Радзевіч. *(Выступленне)*

У выкананні Вікторыі Данілавай прагучыць песня А. Ставера "Беларусачка я!"

Дом – это там, куда готов
Ты возвращаться вновь и вновь.
Там, где тебя всегда поймут,
Там, где надеются и ждут.
Там, где забудешь о плохом –
Это твой дом!.. *(Э. Фаізаў)*

З душэўнай цеплынёй і ўдзячнасцю лёсу гавораць пра свой дом № 23 па вуліцы Гагарына яго жыхары.

З першага дня сумеснага жыцця яны з вялікай любоўю пачалі ўпрыгожваць свой двор, які зараз радуе вока стракатасцю кветнікаў, цяністымі 30-гадовымі дубамі і каштанамі, яблынямі і грушамі.

За 30 год жыхары дома сталі блізкімі людзьмі. Родны двор заўсёды поўніцца дзіцячымі галасамі, а лаўкі каля пад'ездаў, асабліва пад вечар, збіраюць цэлыя нарады па паўсядзённых справах і жыццёвых навінах.

Няхай ваш дом і ваш цудоўны ўтульны двор заўсёды будуць гасціннымі і шчырымі.

Песняй "Бацькоўскі дом"(Сл. А. Лягчылава, муз. А. Молчана) вас вітаюць настаўнікі музыкі Сяргей Рыгоравіч Скаражонак і Міхаіл Уладзіміравіч Ермаковіч

"Жыццё пражыць – не поле перайсці..." –
Старая ісціна, а крочыць новым векам.
Як цяжка на зямлі быць чалавекам,
Што дадзена – пражыць, не прапаўзці. *(І. Лашутка)*

Сапраўды, вельмі хутка бяжыць час. Ён адбірае маладосць і сылы, але яму непадуладны шчырасць людскіх сэрцаў і чысціня душ.

У 23 доме жыў ветэран вайны, сціплы, працавіты і шчыры чалавек – Аляксей Уладзіміравіч Кісялёў. Мы рыхтавалі для яго віншавальную праграму, але ўчора яго не стала. І таму сёння ўсім жыхарам дома, яго родным і блізкім мы выказваем словы шчырага спачування. Няхай Бог супакоіць яго душу у сваім нябесным валадарстве!

Жыццё кожнага чалавека – гэта часцінка гісторыі дзяржавы і ўсяго чалавецтва. Асабліва калі ён быў адданы сваёй сям'і, карыснай справе, роднай зямлі і народу. І калі душа Аляксея Уладзіміравіча зараз прысутнічае сярод нас, то няхай і яна разам з намі азірнецца на гістарычнае мінулае і

паслухае хвалюючую мелодыю роднага краю.

Беларуская народная песня “Зімой і летам”, спявае Паліна Шумская.

І раніцай, і ў дзень, і ў вечар,
І ў гэты час, і ў новы век
Настаўнік свеціць чыстым светам –
Цярплівы, мудры чалавек!

Сярод тых, хто сёння святкуе юбілей роднага дома шмат педагогаў. Гэта Лідзія Ціханаўна Тамашэвіч, якая многія гады аддала прафесіі лагапеда;

гэта Тамара Дзмітрыеўна Сенкевіч, якая выкладала фізіку ў прафесійна-тэхнічным каледжы;

гэта Антаніна Іванаўна Гарчакова – былы дырэктар Вілейскай СШ №3, выдатнік народнай асветы Беларусі і СССР, якая мае 48 гадоў педагагічнага стажу і званне “Ганаровы ветэран горада”;

гэта Тамара Уладзіміраўна Баслык – удзельніца хора ветэранаў, яе непаўторны голас радуе і ўзрушвае душы вілейчан;

гэта педагогі, якія зараз працуюць у гімназіі – Марына Станіславаўна Рэўтская і Жанна Іванаўна Іўлева.

Для вас, шаноўныя настаўнікі, спявае Валерыя Прудніковіч, песня Э. Фаізава “Алые паруса”.

Большасць дзяцей 23 дома вучыліся і зараз вучацца ў нашай гімназіі. Мы шчыра вітаем сем’і нашых вучняў! Для вас на сцэну запрашаецца ***танцавальны калектыў “Карагод”, мастацкі кіраўнік Ірына Генадзьеўна Новік, вальс.***

Мы любим её как хорошего друга
За то, что у нас с нею всё сообща,
За то, что когда нам приходится туго,
Мы можем всплакнуть у родного плеча... *(Н. Саконская)*

Колькі разоў за гэтыя 30 год сумеснага жыцця ў адным доме, калі сапраўды прыходзілася туга, звярталіся яго жыхары да сваіх суседзяў – медыцынскіх работнікаў.

І кожны раз атрымлівалі не толькі добрую параду, але і практычную дапамогу ад Валянціны Міхайлаўны Тонкавіч, чые рукі прынялі не адзін дзесятак маленькіх вілейчан у мясцовым роддоме і ад Соф'і Іванаўны Субач, якая 48 год працавала медыцынскай сястрой, і ад Кацярыны Платонаўны, і ад Вольгі Васільеўны, і ад Ірыны Аляксандраўны, і ад Іраіды Рыгораўны і іншых медыцынскіх работнікаў.

Для вас, шаноўныя, спявае Александра Грабоўская, вучаніца 8 класа, песня А. Маршала і В. Быкава "Белая река"

На свете добрых слов немало,
Но всех добрее и важней одно:
Из двух слогов простое слово "мама",
И нету слов дороже, чем оно! *(І. Мазнін)*

У 23 доме 90 кватэр, і кожная з іх трымаецца на руплівай і дбайнай гаспадыні, добрай і спагадлівай дарадчыцы, шчырай і самаахвярнай малітоўніцы – маці!

Кожная матулька заслугоўвае самай вялікай пашаны і самых высокіх слоў падзякі. Асабліва сёння хочацца ўзгадаць такіх матуль, як Алена Георгіеўна Сцепуценка, якая нарадзіла пяцёра дзяцей і ўсё сваё жыццё прысвяціла ім.

Дарагая Алена Георгіеўна, для Вас і ўсіх матуль 23 дома спяваюць хлопцы ***фальклорнага гурта "Чабарок", беларуская народная песня "Зялёны дубочак"***

Самыя добрыя вочы – матчыны!
Самыя дбайныя рукі – матчыны!
Самае чуйнае сэрца – матчына!
Самая шчырая песня – матчына! *(М. Пазнякоў)*

Беларуская народная песня “У вішнёвым садочку”

У кожным куточку планеты
Вершы складаюць паэты,
Пра самую добрую ў свеце
Песні спяваюць дзеці.
І я расказаць так сама
Хачу пра цябе, мая мама.

Спявае вучаніца 10 класа Дар’я Знак, песня Таісіі Павалій “Мама, мамачка”

У доме № 23 жывуць цікавыя і дабразычлівыя людзі. Некаторыя з іх перайшлі рубеж найцудоўнейшага ўзросту – 85 гадоў! Сярод іх Марыя Іванаўна Смалякова, Зінаіда Філімонаўна Склёміна, Соф’я Іванаўна Субач. Яны для нас з’яўляюцца прыкладам працалюбства і стойкасці, любові і самаадданасці, жыццёвай мудрасці і аптымізму.

Дарагія нашы ветэраны, няхай гады вашага сталага ўзросту будуць напоўненыя бадзёрасцю і жыццёвым натхненнем, радасцю добрых вестак ад вашых блізкіх, клопатам і цеплынёй усіх людзей, што жывуць побач.

Для вас іграе лаўрэат міжнародных конкурсаў гарманістаў, ***настаўнік музыкі Барыс Пятновіч Харэвіч, “Арлоўскія страданні”.***

Не зайздрошчу таму, каму лёгка жывецца,
Каму ў жыцці ўсё проста даецца,
Хто не зведаў ні стомы, ні поту,
Хто не меў мазалёў ад работы,
Хто сапраўднага шчасця не знае –
І ў гэтым жыцці пра вечнасць не дбае...

(У. Весялуха)

Загадкавы чалавечы лёс... Адзін матузок ад яго вузельчыка трымае сам

чалавек, а другі – скрыты ад нас – у руках Божых. Наша жыццё ад нараджэння да смерці – вялікая таямніца! Можа, таму і адчувае чалавек у трапяткім сваім зямным шчасці крупінку незадаволенасці, і вабіць яго сваім бязмежжам Вечнасць...

І зараз кожны з нас можа малітоўна ўзгадаць сваіх суседзяў, родных і блізкіх людзей, якія жылі з намі і адышлі ў гэтае блажэннае бязмежжа...

Сярод многіх, чые імёны будуць жыць у нашых сэрцах, мы можам сёння ўзгадаць і Леаніда Іванавіча Кебеца, які доўгі час працаваў на кіруючых пасадах у даволі складаны для нашай дзяржавы час, да канца аддаваў сябе працы і, можа, таму да часу пайшоў з жыцця.

Мы сёння схіляем галовы перад светлай памяццю нашых бацькоў, суседзяў, сяброў і блізкіх, каго няма з намі, і будзем мець надзею, што наша малітоўная памяць дойдзе да Бога і Той ахіне іх крылом сваёй вечнай Любові.

Спявае вучань 10 класа Андрэй Крачкоўскі, студыя патрыятычнай песні "Спадчыны", сл. К. Губіна, муз. С. Паўліашвілі "Памолимся за родителей"

Другі пад'езд 23 дома лічыць сябе самым дружным. Яго суседзі заўсёды разам: і ў радасці, і ў горы. Так шматгадовая шчырая дружба звязвае Алу Аляксандраўну Занковіч, Тамару Аляксандраўну Пыск, Надзею Пятроўну Семянёк, Ніну Аркадзьеўну Герасімаву і многіх іншых.

Для другога пад'езда, сваіх суседзяў, і ўсіх жыхароў роднага дома спявае ***Святлана Валер'еўна Мацукевіч, песня Ірыны Круг "Пой, гитара звонкая!"***

Для сваіх сяброў з дома № 23 ***спявае Уладзімір Яфімавіч Цанунін, настаўнік гісторыі, аўтарская жартоўная песня "Стары анекдот"***

Не ведаю стомы прыемней,
Чым стома, аблітая потам.

Я лепшай не ведаю песні,
Чым песня пасля работы.
Дзівосней не знаю часіны
За ранак, туманам спавіты.
Не ведаю лепшага смаку
За хлеб, мазалямі здабыты. *(У. Весялуха)*

Як і большасць вілейчан, жыхары 23 дома па вуліцы Гагарына – гэта добрыя працаўнікі, якія не шукаюць для сябе цёплага месца ці асабістых узнагарод. Яны жывуць у працы, вучацца радавацца жыццю ва ўсіх яго праявах і стараюцца пакінуць пасля сябе добры след на роднай зямлі.

Сярод руплівых працаўнікоў мы з радасцю ўзгадваем сёння будаўнікоў Пятра Аляксандравіча Рамейку і Яўгенію Міхайлаўну Жук;

былую работніцу хлебазавода Генрыету Казіміраўну Козак і завода "Зеніт" Валянціну Іванаўну Плотнікаву;

супрацоўніка завода "Буддэталі" Аляксандра Васільевіча Хвіневіча, загадчыцу магазіна Валянціну Іванаўну Трацінка, старшыню райкома прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Святлану Леанідаўну Валынец і многіх, многіх іншых.

Дарагія сябры, няхай ваша праца будзе плённай і для вашай сям'і і для роднага горада, і для ўсёй нашай Беларусі. Здароўя вам, міру і дабрабыту!

Для вас зноў на сцэну выходзіць танцавальны калектыў "Карагод" - ***"Ірландскі танец"***

Есть место, где любят без особых причин:
За то, что ты внук,
За то, что ты сын,
За то, что малыш,
За то, что растешь,
За то, что на маму и папу похож.
И эта любовь до конца твоих дней

Останется тайной опорой твоей. *(В. Берастаў)*

Якое прыгожае слова – сям'я! Як грэе яно душу, напамінаючы пра ласкавы голас матулі і клапатлівую строгасць бацькі, пра замілаваны погляд бабулі і задуменную маўклівасць дзядулі.

Няхай вашы сем'і, дарагія сябры, будуць заўсёды пад надзейнай абаронай добрага лёсу. Няхай вашы кватэры будуць радаснай і шчаслівай прыстанню для вашых дзяцей, унукаў і праўнукаў.

Няхай вашы вокны ззяюць вясельным святлом, а да суседзяў даносіцца толькі шчаслівы смех і душэўная песня.

І зноў на сцэне ***Міхаіл Уладзіміравіч Ермаковіч і Сяргей Рыгоравіч Скаражонак, аўтарская жартоўная песня "Сталіца"***

Шанаваць бацькоў – гэта значыць: у дзяцінстве іх слухаць, у маладосці з імі раіцца, а ў дарослым узросце пра іх клапаціцца.

Калі гэты запавет выконваеца, то можна сказаць, што зярняткі любові ў сям'і былі пасеены не дарма, а далі мажныя ўзыходы і спелыя плады.

Мы жадаем вам сямейнага шчасця, цярпення, узаемапаразумення і той вялікай любові, якая мацуе сем'і і робіць іх сапраўднымі.

Сапраўдным сем'ям 23 дома і ўсім вам ***ансамбль "Карагод" дорыць вясёлы танец.***

А в жизни слишком много «жизни нет»,
И денег нет, и всё не так как надо…
Но я рассвету солнечному рада,
Ведь он приносит в новый день билет…

В судьбе людей так много «не о том»,
Мы тратим жизнь на поиски удачи,
И за добро мы требуем отдачи,
Но этот жест нельзя назвать добром…

А в жизни слишком мало есть минут,
Чтоб исправлять содеянное нами…
Давайте дорожить семьёй, друзьями,
И все ответы сами нас найдут… *(І. Самарына)*

Для вас іграе дыпламант Рэспубліканскага фальклорнага фестывалю “Берагіня” ***фальклорны гурт “Чабарок” Вілейскай гімназіі №2, мастацкі кіраўнік Тацяна Валер’еўна Каркотка, музычны кіраўнік Барыс Пятровіч Харэвіч, беларуская народная песня “Талака” і “Местачковая полька”.***

Мы жадаем шчасця, міру і дабрабыту жыхарам дома № 23 па вуліцы Гагарына і ўсім ўдзельнікам сённяшняга свята. Няхай Бог мацуе вашы сілы ў непахіснай веры, у неўміручай надзеі і ў сапраўднай любові!

Фальклорны гурт “Чабарок”, беларуская народная песня “Звіняць, звіняць звончыкі”

У сцэнарыі выкарыстаны вершы нашых землякоў Івана Іосіфавіча Лашуткі і Уладзіміра Мікалаевіча Весялухі, іншых аўтараў.

Вядучыя Ірына Генадзьеўна Новік і Уладзімір Аляксеевіч Версан.

Канцэртная праграма завершана, але свята працягваецца.

Мы запрашаем вас **на выставу “Сямейны альбом” і танцавальную праграму “Мелодыі маёй маладосці”** ў файе першага паверха гімназіі.

Прыемнага вам адпачынку!